# ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ «СЯМЕЙНАЯ ПЕДАГОГІКА» (VII клас)

***В. А. Вітко***
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Грэская сярэдняя школа»,*
*Рэспубліка Беларусь*

***Анатацыя.*** У распрацоўцы прадстаўлены практычны матэрыял для правядзення факультатыўных заняткаў па тэме «Сродкі і метады беларускай сямейнай педагогікі». На прыкладзе сітуацый, апісаных у творах Якуба Коласа, адпрацоўваюцца ў вучняў уменні распазнаваць і ацэньваць сродкі і метады сямейнага выхавання.

**Тэма**: Сродкі і метады беларускай сямейнай педагогікі

**Мэта:** фарміраванне разумення і першаснага вопыту выхавання і самавыхавання.

**Задачы:**

1) стварыць умовы для засваення вучнямі сутнасці асноўных метадаў беларускай сямейнай педагогікі;

2) садзейнічаць развіццю ўменняў распазнаваць і ацэньваць сродкі і метады сямейнага выхавання;

3) выхоўваць павагу да нацыянальных традыцый, садзейнічаць самавыхаванню вучняў.

**Тып правядзення заняткаў:** камбінаваны.

**Спосабы дзейнасці вучняў:** калектыўны, парны, індывідуальны.

**Абсталяванне факультатыўных заняткаў:** выстава кніг Якуба Коласа, табліца “Метады і сродкі народнага выхавання ў беларускай сям’і”, канверт з “падказкамі”, карткі з тэкстамі, стыкеры.

**Ход заняткаў**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Уступнае слова настаўніка. Паважаныя сябры, сёння мы прадоўжым працу над трэцім модулем факультатыўных заняткаў «Традыцыі беларускай народнай педагогікі ў сямейным выхаванні». Тэма нашых заняткаў «Сродкі і метады беларускай сямейнай педагогікі». Як вы лічыце, чаму да гэтых заняткаў у класе зроблена выстава кніг беларускага песняра Якуба Коласа? (Мяркуемыя адказы вучняў: – Якуб Колас шмат пісаў для дзяцей. – Якуб Колас напісаў паэму «Новая зямля» пра жыццё беларускага народа. – Якуб Колас быў настаўнікам…)

Настаўнік робіць падагульненне выказванням вучняў. Усе творы выдатнага паэта, пісьменніка, педагога Якуба Коласа адлюстроўваюць жыццё нашага народа. У шматлікіх творах ён прапагандаваў гуманныя адносіны да дзяцей, заклікаў развіваць талент і здольнасці падрастаючага пакалення. Паказваючы жыццё беларускага парода ва ўсіх яго праяўленнях, Колас, вядома, не мог не адлюстраваць такі жыццёвы аспект, як выхаванне дзяцей ў сям’і. На занятках паспрабуем правесці невялікую даследчую работу па вызначэнні сродкаў і метадаў беларускай сямейнай педагогікі на прыкладзе сітуацый з твораў Якуба Коласа.

**ІІ. Этап актуалізацыі ведаў, атрыманых вучнямі на папярэдніх занятках**

Для таго, каб заняцца даследчай дзейнасцю, неабходна ўспомніць матэрыял папярэдніх заняткаў. Метад “Завяршы сказ” (калі вучню цяжка выканаць заданне, ён можа звярнуцца да канверта з “падказкамі”):

1) Значымай і неад’емнай часткаў агульнай духоўнай культуры народа з’яўляецца … (народная педагогіка).

2) Асноўныя прынцыпы народнай сямейнай педагогікі беларусаў – гэта культуралагічная адпаведнасць, прыродазгоднасць, адзінства выхавання і ладу жыцця, мяккасць у спалучэнні з … (патрабальнасць і строгасць).

3) Народная мудрасць беларусаў аб сям’і і сямейным выхаванні знайшла шырокае адлюстраванне ў … (вусная народная творчасць).

4) Асаблівасцю ўнутрысямейных адносін у беларусаў быў … (бясспрэчны аўтарытэт бабуль і дзядуляў).

5) Да дзяцей сваякоў і да суседскіх дзяцей, якія па розных прычынах аказаліся сіратамі, усе члены сям'і адносіліся … (міласэрна і добразычліва).

6) Пачуццё ўзаемнай адказнасці за выхаванне дзяцей з боку і бацькі, і маці – гэта … (педагагічнае раўнапраўе).

Рэфлексійны момант. Ці цяжка было вам выконваць заданне? Што было лёгкім?

**III. Асноўны этап**

1. Калектыўны разгляд з каментарыямі настаўніка табліцы «Метады і сродкі народнага выхавання ў беларускай сям'і»:

<table>
<tr><th>Асноўныя метады выхавання</th><th>Дапаможныя метады выхавання</th></tr>
<tr><td>перакананне, унушэнне, парада, наказ;</td><td rowspan="6">дакор, папрок, асуджэнне, вымова; пагроза, застрашванне, абзыванне;<br>пакаранне з мэтай ліквідацыі адмоўных якасцей і ўчынкаў</td></tr>
<tr><td>прыклад і аўтарытэт бацькоў;</td></tr>
<tr><td>прывучанне, замацаванне (практыкаванне)</td></tr>
<tr><td>гутарка, навучанне, развага, перасцярога</td></tr>
<tr><td>выпрабаванне, спаборніцтва, грамадская думка</td></tr>
<tr><td>заахвочванне, пахвала, благаслаўленне</td></tr>
<tr><td colspan="2">Сродкі выхавання</td></tr>
<tr><td colspan="2">праца, гульні, святы і абрады, звычаі, традыцыі, фальклор</td></tr>
</table>

2. Даследчая работа ў парах. Вучням неабходна пазнаёміцца з сітуацыяй, прааналізаваць яе і вызначыць, які метад беларускай сямейнай педагогікі прадстаўлены Якубам Коласам, абгрунтаваць свой выбар.

Для правядзення даследавання вучням прапануюцца наступныя ўрыўкі з твораў Якуба Коласа, якія вывучаліся на ўроках беларускай літаратуры.

<table>
<tr><td>1) Верш «У школку»<br>– Ну, Ігнат, глядзі брат,<br>Не дурэй, вучыся.<br>Годзе жыць без дзела –<br>За буквар вазьміся!<br>Будзь старанным, сынку, –<br>Станеш чалавекам,<br>Будзеш ты чытаць нам,<br>Цёмнікам, няўмекам…</td><td>2) Верш «У школку»<br>А старанны будзеш,<br>Да навукі здатны –<br>Я прадам кароўку<br>І кажух астатні, –<br>Ты ж ідзі ў навуку,<br>Толькі, брат, вучыся<br>Дык, глядзі ж, сыночак,<br>Шчыранька вазьміся!</td></tr>
<tr><td>3) «Дарэктар» (паэма «Новая зямля»)<br>Ох, слаўна з дзядзькам ім жылося!<br>Яшчэ замецьце, што з малымі<br>Ён размаўляў, як са старымі,<br>І з імі радзіўся, спрачаўся –<br>Як роўны з роўнымі трымаўся!<br>Калі ж хто часам з ім не зладзіць,<br>То дзядзька толькі вус пагладзіць,<br>Але не скажа ён нічога,<br>Бо ведаў, чым даняць малога, –<br>Гаворыць з тым, з кім дзядзька ў згодзе:<br>– Калі такі ён, ну, то годзе! –<br>І дзядзька змоўкне, пачакае,<br>Кісет дастане і закурыць<br>І вочы чутачку прыжмурыць,<br>Як бы і ў памяці не мае.</td><td>4) «Дзядзька-кухар» (паэма «Новая зямля»)<br>Наш дзядзька, мілы наш Антоні,<br>Ў дзіцячым часта быў палоне:<br>Вось так гуртом яго абсядуць<br>І час работы яго крадуць;<br>Насі «катла», кажы ім казкі,<br>Ідзі на паплаў з імі ў краскі,<br>Давай адказы на пытанні,<br>Тлумач ты ім усё дазвання:<br>Адкуль, з чаго дзе што бярэцца,<br>Вось гэта, тое як завецца<br>І чаму так, чаму не гэтак?<br>Прыхілен дзядзька быў да дзетак.<br>Ён быў настаўнікам, суддзею,<br>Калі, бывала, між сабою<br>Паспораць дзеткі ці паб'юцца,<br>Дык да каго тады звярнуцца,<br>Як не да дзядзькі, да Антося?</td></tr>
</table>

| 5) *“За сталом” (паэма “Новая зямля”)*<br>А за сталом маўчком сядзелі.<br>Там хлопцы гыркацца не смелі,<br>Бо там парадак вельмі строгі,<br>Там падпілуюць табе рогі,<br>Калі парушыш дысцыпліну,<br>Ды пад нядобрую часіну<br>Дадуць там «лэмбуся» і «квасу»,<br>Каб не круціліся без часу.<br>І чуць калі што вынікала,<br>То бацька кідаў так, бывала,<br>На хлопцаў погляд выразліва,<br>Што тыя ў лаву баязліва<br>Траха са страху не ўпаўзалі,<br>Бо гэты погляд добра зналі. | 6) *«Дзядзька-кухар» (паэма «Новая зямля»)*<br>– Ну, вось дарэктар вам, глядзеце!<br>Міхал ківае тут на Яську. –<br>За кнігі заўтра і за ўказку,<br>Бо грошы бацькавы – не смецце,<br>Каб мне вучыліся старанна!<br>Не патураць ім анізвання! –<br>Міхал звярнуўся к «дарактору»:<br>– А не паслухае каторы –<br>Цягні за вуха на калені:<br>Знайду лякарства я ад лені!<br>А будзе йсці навука туга,<br>Падгоніць бацькава папруга! |
|---|---|
| 7) ***Паэма «Сымон-музыка»***<br>– Што стаіш там, як закляты?<br>Гора ты нам, не дзіця! –<br>Кажа маці: – Ідзі ў хату,<br>Недапека ты, куцця! –<br>І ўздыхнула. Мусіць, матцы<br>Шкода стала бедака. | |

3) Выступленні вучняў з абгрунтаваннем свайго выбару (пры неабходнасці настаўнік праводзіць карэкцыю вучнёскіх меркаванняў). Падагульняльнае слова настаўніка аб тым, што творы Якуба Коласа перадаюць нам, новым пакаленням, педагагічную мудрасць беларускага народа.

4) Слова настаўніка аб асаблівых адносінах у беларускіх сем’ях да хлеба, да цяжкай працы хлебароба, ноагул да працы. Настаўнік расказвае вучням пра дзядзькаванне – звычай шляхты ў ВКЛ у XVI–XVIII стагоддзях аддаваць у сялянскія сем’і сваіх дзяцей, каб сфарміраваць у нашчадкаў працавітасць, непераборлівасць у побыце, адданасць роднай зямлі, далучыць да народных традыцый. Традыцыя «дзядзькавання» знайшла сваё адлюстраванне ў геніяльным рамане Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім».

**IV. Карэкцыйна-рэфлексійны этап**

Суразмоўніцтва з вучнямі:

**–** Што было для вас самым цікавым на сённяшніх занятках? Адкажыце адным сказам.

– Падумайце, калі вы самі станеце бацькамі, то якія метады выхавання дзяцей будзеце выкарыстоўваць? Падыдзіце да табліцы «Метады і сродкі народнага выхавання ў беларускай сям’і» і пазначце стыкерамі свой выбар.

### *Літаратура*

1. Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Этнапедагогіка: гісторыя і сучаснасць»: «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна» 17–18 кастрычніка 2013 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: file:///G:/народная %20педагогіка/etnopedagogika.pdf – Дата доступу: 07.10.2019.